# АРГАНІЗАЦЫЯ ШТОКВАРТАЛЬНЫХ ТЫДНЯЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК УДАСКАНАЛЕННЯ ЗНОСІН НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ВА ЎМОВАХ РУСКАМОЎНАЙ УСТАНОВЫ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

***Лазоўская Алена Іванаўна,***
*загадчык дзяржаўнай ўстановы адукацыі*
*“Яслі-сад № 1 г.Дзятлава”*

Асноўным сродкам навучання дзяцей беларускай мове, навыкам маўленчых зносін выступае камунікатыўнае асяроддзе.

Мы разумеем, што вучыць дзяцей трэба на лепшых узорах роднай мовы, і ў гэтым вядучая роля належыць педагагічным работнікам, якія пастаянна кантактуюць з дзецьмі і ад якіх дзеці пераймаюць, засвойваюць культуру маўлення, маюць магчымасць адчуць прыгажосць роднай мовы, яе мелодыку, своеасаблівасць, зацікавіцца роднай мовай. Работа ў дадзеным накірунку павінна мець практычны напрамак.

У межах работы творчай групы педагагічных работнікаў раёна мы распрацавалі і апрабіравалі тэматычныя тыдні. Гэта стала для нас актуальным, бо выкарыстанне аднаго дня для развіцця беларускага маўлення было недастаткова. Анкетаванне бацькоў “Развіццё беларускага маўлення ў сям’і” паказала, што нашы выхаванцы не атрымліваюць якаснага і дастатковага ўзору беларускага маўлення, не чуюць беларускай мовы ў тым аб’ёме, які неабходны для своечасовага самастойнага “ўрастання” ў яе. Руская мова як мова сям’і з’яўляецца дамінантнай для многіх дзяцей.

Правядзенне адзін раз на квартал тыдня беларускай мовы, на наш погляд, з’яўляецца адным з эффектыўных сродкаў работы з усімі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу. Гэта дазваляе ствараць умовы для ўдасканалення моўных уменняў, фарміравання ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай мовы, жаданне авалодаць ёю, навучыць з павагай ставіцца да роднай мовы. Дапамагае папоўніць і актуалізаваць беларускі слоўнік як у дзяцей, так і ў педагогаў, бацькоў, садзейнічае фарміраванню правільнага вымаўлення, эстэтычных адносін да традыцый беларускага народа.

Падрыхтоўчая работа вядзецца загаддзя. Творчай групай педагогаў распрацоўваецца праграма правядзення тыдня. Мы выкарыстоўваем тэматычны прынцып планавання тыдня. Кожны дзень мае сваю назву.

Пры распрацоўцы мерапрыемстваў кожнага дня тыдня ўлічваем прынцыпы займальнасці, даступнасці, актыўнага ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу.

Для бацькоў распрацоўваюцца інфармацыйныя лісткі ”Мастацкія творы для чытання дзецям”, “Шануйце мову родную”, “Беларускія народныя казкі ў жыцці дзіцяці” і іншыя. Прапаноўваюцца творы беларускай дзіцячай літаратуры,

якія варта прачытаць дзецям. Педагогамі распрацоўваецца рубрыка “Знаёмая незнаёмка”, дзе раскрываем значэнне асобных беларускіх слоў, збіраем прыклады сінонімаў, беларускіх прыказак. Афармляем выстаўкі-прэзентацыі, перанасныя стэнды-дапаможнікі (цуда-дрэўцы), дзе можна знайсці дапамогу не толькі ў перакладзе слоў, але і даведацца аб парадах тым, хто хоча размаўляць па-беларуску, прачытаць аб’явы дня.

Традыцыйна, у першы дзень адкрыцця тыдня беларускай мовы, у группах з’яўляюцца сімвалы беларускага дня: лялькі Алесь і Янка, Марылька ці Бульбашык, якія заахвочваюць дзяцей і дарослых да размовы па-беларуску. З самай раніцы ў садку гучаць беларускія мелодыі і песні, родная беларуская мова. А цуда-дрэўцы, што з'яўляюцца ў фае і на лесвіцах, напамінаюць аб тым, што пачаўся тыдзень беларускай мовы, што ўсе павінны вітацца і размаўляць на роднай мове.

Сення хачу пазнаёміць з найбольш запамінальнымі мерапрыемствамі тыдня беларускай мовы “Гучы, родная мова!”, дэвіз якога быў “Калі ласка, размаўляй са мной па-беларуску”.

Кожны дзень меў сваю назву: першы дзень –“Любімае роднае слова”, другі – “Сябруем і гуляем разам”, наступныя дні – “ У гасцях у казкі”, “Мой родны кут”,“Люблю старонку родную”.

У межах тыдня праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне прафесійнага ўзроўню педагогаў.

Так, дзелавая гульня “Вучым беларускую мову разам” садзейнічала ўдасканаленню прафесійных ведаў і ўменняў педагагічных работнікаў, зацікавіла іх багаццем беларускай мовы. Гульня атрымалася вострай і захапляючай. Назвы каманд былі звязаны з беларускай граматыкай: “Сказ”, “ Слова”, “Літара”. Незвычайным для ўдзельнікаў быў конкурс “Папацей, грамацей!” Дыктант па беларускай мове пісалі камандай. Кожнаму члену каманды трэба было напісаць адзін сказ і перадаць лісток наступнаму свайму таварышу, вынік залежаў ад ведання граматыкі кожным удзельнікам каманды. Праявіць свой інтэлект педагогі змаглі пры рашэнні рэбусаў для замацавання правіл беларускай арфаграфіі.

Хуткасць і знаходлівасць праявілі педагогі ў гульні “Цудоўная скарбонка”, дзе трэба было не толькі перакласці словы на беларускую мову, але і ўспомніць прыказкі і прымаўкі з гэтымі словамі.

Заслугоўвае ўвагі выстава-прэзентацыя “Адвечны голас Радзімы”, падрыхтаваная педагогамі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, якая садзейнічала інфармаванню педагагічных работнікаў аб навінках вучэбных выданняў, аб творах мастацкай літаратуры.

Выданні на выставе былі размеркаваны па раздзелах: “Ад знака да літары” *(прадстаўлены кнігі і артыкулы пра развіццё пісьменства),*
“Ключ да ўсіх навук” *(прадстаўлена літаратура па граматыцы беларускай мовы),* ”Слаўнае багацце мовы” *(прадстаўлены слоўнікі беларускай*

*мовы);”*Вялікі дар нашчадкам” *(прадстаўлены кнігі па фальклоры*), “Чарадзеі роднага слова” *(прадстаўлены творы беларускіх пісьменнікаў рознага жанру).*

Арганізацыя работы з выхаванцамі ў межах тыдня насіла практычны накірунак. Займальна і яскрава прайшлі мерапрыемствы з дзецьмі ў дзень “Сябруем і гуляем разам”.

Выхаванцы малодшых груп з захапленнем вадзілі гульні-карагоды са спалучэннем мелодый, слоў, рухаў, далучаючыся да багацця беларускай мовы. Чытанне пястушак і забаўлянак прынесла многа радасці і задавальнення, узбагаціла слоўнік, садзейнічала развіццю міжвольнай увагі, памяці.

Правядзенне рухомых гульняў “А мы проса сеялі”, “Грушка”, “Бярозка” садзейнічалі выхаванню ў дзяцей старшых груп цікавасці да беларускай народнай творчасці, да роднай мовы. Праз народныя гульні “Лянок”, “Агароднік” дзеці знаёміліся з асноўнымі сельскагаспадарчымі працэсамі.

Цікава і змястоўна прайшла віктарына "Мой любы горад", у якой прымалі ўдзел дзве каманды дзяцей старшага ўзросту "Рамонак" і "Лянок". Выхаванцы паказвалі свае веды аб малой Радзіме, сваім горадзе: называлі вуліцы горада, знакамітых землякоў, знаходзілі знаёмыя будынкі горада. Вялі гутарку аб значэнні кожнага аб'екта, аб рабоце грамадскіх устаноў: пошты, крамы, бібліятэкі і г.д., прадэманстравалі свае веды гісторыка-культурнай спадчыны і сучасных дасягненняў. З гонарам і ахвотай знаходзілі прыгожыя словы для пажаданняў гораду: быць прыгожым, чыстым, утульным. На працягу гульні ішло напружанае інтэлектуальнае спаборніцтва, каманды бліскуча адказвалі на самыя складаныя пытанні. У час гульні дзеці вучыліся слухаць адзін аднаго, працаваць у камандзе.

Урачыста прайшоў конкурс юных чытачоў “Каб мова родная гучала”. Вершы на беларускай мове дэкламавалі выхаванцы ўсіх груп. Малодшыя дашкольнікі пяшчотна і ласкава чыталі творы пра цацкі, з якімі вельмі любяць гуляць, любімых хатніх жывел, прыроду. Дзеці сярэдняга і старшага ўзросту прыгожа, пранікнёна чыталі вершы пра сваю Радзіму, пра родны край, імкнучыся перадаць свае пачуцці і прыгажосць твора. Напрыканцы конкурсу ўдзельнікі атрымалі шмат пазітыўных эмоцый, сертыфікаты, дзіцячыя кніжкі.

З мэтай знаемства дашкалят з мясцовымі паэтэсамі прайшла сустрэча ў літаратурнай гасцёўні з Лакізай Раісай Уладзіміраўнай і Абрамчык Аленай Рыгораўнай. У цёплай добразычлівай атмасферы дзеці з задавальненнем слухалі вершы пра родную прыроду, край, горад Дзятлава. Пачулі цікавыя гісторыі з дзяцінства паэтэс на мілагучнай беларускай роднай мове.

Запамінальным стаў дзень “У гасцях у казкі”. Выхаванцы старшай групы паказалі тэатралізаваную пастаноўку “Муха-пяюха” для дзяцей малодшых групп. Завіталі ў госці вучні СШ №3 г.Дзятлава, удзельнікі тэатральнай студыі "Юныя артысты” з гульнявой праграмай “Па старонках казак”. Выхаванцы садка наперабой адгадвалі назву казкі і яе герояў па міні -эцюдах, якія падрыхтавалі вучні школы.

Актыўны ўдзел у правядзенні тыдня “Гучы, родная мова” прымалі бацькі нашых выхаванцаў. Вынікам узаемадзеяння стала выстава “Беларускія народныя казкі з бабульчынага куфэрка”. Дарослыя разам з дзецьмі прэзентавалі самаробныя кніжкі па творах беларускай мастацкай літаратуры, народных казках. Кніжкі прыцягвалі ўвагу да сябе арыгінальным афармленнем: былі зроблены з розных матэрыялаў, тканіны, фетру, кардону, паперы, упрыгожаныя вышыўкай, аплікацыяй, малюнкамі дзяцей. Якім шчасцем і радасцю свяціліся вочы дзяцей, калі яны расказвалі пра сумесныя творчыя вечары ў крузе сям’і пры стварэнні сваіх твораў.

Назіраючы, з якой любоўю і пяшчотай дзеці і дарослыя размаўляюць на сваёй роднай беларускай мове, успамінаюць традыцыі беларускага народа, гуляюць у народныя гульні, спяваюць песні, пераканаліся, што арганізацыя штоквартальных тыдняў беларускай мовы з’яўляецца эфектыўным сродкам удасканалення зносін на беларускай мове ва ўмовах рускамоўнай установы дашкольнай адукацыі.